КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА
№2(138)
15 студзеня 2015 Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь

# ПЯЦЬ ЗМЕНАЎ, ЯКІЯ ПАДОРЫЦЬ НАМ ДЗЯРЖАВА Ў 2015 ГОДЗЕ

***Падаражанне разводаў і новыя штрафы, мацярынскі капітал і 25 гадоў турмы за наркотыкі — па якіх новых законах мы зажывем з 1 студзеня. Падрабязнасці ў матэрыяле Еўрарадыё.***

***1) СКАСАВАЦЬ ШЛЮБ БУДЗЕ ДАРАЖЭЙ***

На 30 тысяч павялічваецца базавая велічыня — да 180 тысяч рублёў. Вырасце ўсё, што прывязана да яе. Узяць ці скасаваць шлюб будзе каштаваць 540 тысяч, замяніць пашпарт ці зарэгістраваць ІП — 90 тысяч. А штраф за перавышэнне хуткасці можа дасягнуць 2,7 мільёна рублёў.

***2) ЗМЕНЯЦЦА ПРАВІЛЫ БЯСПЕКІ ДАРОЖНАГА РУХУ***

З 16 студзеня для легкавых аўтамабіляў абавязковым стане выкарыстанне зімовых шынаў (з 1 снежня па 1 сакавіка). Штраф за парушэнне — 90 тысяч. Абавязковым стануць дзіцячыя крэслы. Зменіцца і мінімальна дапушчальная ступень светлапрапускальнасці для ветравога шкла аўтамабіляў — з 75 да 70%.

***3) НОВЫЯ ПРАВІЛЫ ДЛЯ ІНТЭРНЭТА***

Цяпер у любых інфармацыйных інтэрнэт-рэсурсаў і блогаў будзе адказнасць як у СМІ. Разам з гэтым, уладальнік сайта вымушаны будзе кантраляваць каментарыі, якія размяшчаюцца на інфармацыйным рэсурсе. Невыкананне гэтых патрабаванняў будзе з'яўляцца падставай для вынясення папярэджання Міністэрствам інфармацыі, пры двух папярэджаннях доступ да сайта на тэрыторыі Беларусі можа быць абмежаваны без суда.

***4) СЯМЕЙНЫ КАПІТАЛ***

За трэцяга і наступных дзяцей, якія народзяцца з 1 студзеня 2015 па 31 снежня 2019 года, дзяржава будзе класці на рахунак пад працэнт 10 тысяч долараў.

Прэзідэнт: “Яны змогуць скарыстацца гэтым капіталам праз 18 гадоў. Гэта ўжо будзе, мы пралічылі, 14 тысяч долараў, а можа быць нават 15 тысяч”.

За сямейным капіталам можа звярнуцца на працягу 6 месяцаў з дня нараджэння ці ўсынаўлення дзіцяці. Капітал можна будзе выкарыстаць для паляпшэння жыллёвых умоваў, атрымання адукацыі, але толькі калі дзіцяці споўніцца 18 гадоў. Сродкі могуць быць выкарыстаныя датэрмінова ў выпадку хваробы каго-небудзь з сям'і.

***5) АНТЫНАРКАТЫЧНЫЯ МЕРЫ***

Павялічваюцца тэрміны пазбаўлення волі за збыт наркотыкаў (напрыклад, на тэрыторыі ўстановы адукацыі — з 13 да 15 гадоў); за збыт наркотыкаў заведама непаўнагадоваму — з 8 да 15 гадоў. Да 14 гадоў будзе паніжаны ўзрост прыцягнення да крымінальнай адказнасці. Стане верагодным, што злачынца за наркату можа атрымаць тэрмін большы, чым пражытае ім жыццё. Па дадзеных МУС у бягучым годзе было 361 нарказлачынстваў з удзелам непаўналетніх.



Таксама ўводзіцца адміністрацыйная адказнасць за з'яўленне ў грамадскім месцы ў стане, выкліканым ужываннем псіхатропных рэчываў — штраф ад 5 да 10 базавых і ўнясенне ў адмысловы рэестр спажыўцоў, за паўтор на працягу года — нават абмежаванне волі да двух гадоў.

# СУД ПРИГОВОРИЛ ИРИНУ МОЦНУЮ К ЛИШЕНИЮ СВОБОДЫ

## *Подробности уголовного дела до сих пор остаются неизвестными для общественности*

**Тимур НЕЗВАНОВ**

***Ирина Моцная, бывшая приемная мать из города Климовичи, приговорена к четырём годам лишения свободы в декабре минувшего года. Суд Климовичского района признал её виновной в злоупотреблении правами опекуна или попечителя. После вынесения приговора подсудимая была взята под стражу в зале суда.***



Всё началось в июне, когда покончил с собой приемный отец Виктор Моцный. Спустя некоторое время Ирину Моцную лишили права опеки над детьми. Однако женщина не согласилась с таким решением, и стала обращаться в различные инстанции с просьбой разрешить и дальше воспитывать приемных детей.

Конфликтная ситуация привела к тому, что вначале на Моцную составили административный протокол и оштрафовали за самоуправство. В конце августа следственные органы возбудили в отношении неё уголовное дело по ст. 176 УК (злоупотребление правами опекуна или попечителя). Впоследствии уголовное дело пополнилось еще двумя составами: ч. 2 ст. 154 УК (истязание, совершенное в отношении несовершеннолетнего) и ч. 1 ст. 183 УК (ограничение личной свободы человека).

И вот 19 декабря суд Климовичского района приговорил бывшего приемного родителя-воспитателя Ирину Моцную к 4 годам лишения свободы в колонии в условиях общего режима. Суд проходил в закрытом режиме, поэтому подробности уголовного дела до сих пор остаются неизвестными для общественности. Журналисты портала TUT.BY, следившие за делом с самого начала, сообщили: «В чём конкретно обвинили Моцную и почему дали такой большой срок, знает лишь ограниченный круг людей».

Одним из таких людей, согласившихся встретиться с прессой, оказался родной сын Ирины Моцной Дмитрий. По его словам, «ограничение свободы человека», в котором обвинили его мать, заключалось только в том, что женщина в целях воспитания могла закрыть кого-то из детей в комнате и поставить в угол. Что касается «истязания несовершеннолетнего», то иногда, бывало, детям «перепадало и ремнём». «Но крайне редко, - рассказал журналистам TUT.BY Дмитрий. - Эти случаи по пальцам можно пересчитать!».

При этом сами дети, общаясь неоднократно с корреспондентом TUT.BY, называли такого рода наказание мягким и нужным для их же воспитания.

Дмитрий: «Как приемных детей, так и меня с Виталиком (вторым родным сыном Ирины Моцной) воспитывали всегда одинаково. Я что, какой-то ненормальный человек вырос, отучившись в вузе? Или Виталик, один из лучших студентов в своем вузе? А другие приемные дети, которые воспитывались, выучились и имеют приличную работу? Маме вменяют истязание, ограничение свободы! Какое ограничение?! Дети в школу ходили постоянно! Если мама поставила кого-то в угол, то это ограничение свободы?! Я знаю точно и был свидетелем, что в угол мама могла поставить ребенка за серьезную провинность, за воровство. Дети из детдомов — сложные, но они меняются, если к ним найти правильный подход. Просто разговоры с ними не всегда срабатывают. Я вот хотел бы спросить у президента, который создаёт ощущение человека, который воспитывался строго: неужели его никогда не ставили в угол и не использовали ремень? И как мы докатились до того, чтобы родителей в нашей стране за воспитание сажали в тюрьму? Или у нас образовалось новое государство в городе Климовичи, и каким-то образом его все покрывают? Как это охарактеризовать, я не знаю. Адвокат подаст жалобу, потому что это всё жестоко, очень жестоко».

«Этот приговор похож на большую предвзятость, на показательный процесс. Как адвокат мне объяснила, были все поводы, чтобы дать маме хотя бы условное наказание. Адвокат сказала, что сама хотела бы видеть мотивационную часть решения суда, потому что такого жёсткого решения не ожидал никто. За убийства, может, столько дают. Я просто в шоке, ведь сам маму убеждал, что все эти уголовные дела — это мелочи, что их возбудили только для того, чтобы выгородить себя. До этого она воспитывала 16 лет детей, и всё было хорошо! А когда она где-то пошла против, начала жаловаться, началось сильнейшее давление. Мама начинала писать жалобы в прокуратуру, судиться, а ей всё время какие-то отписки. Но она не сдавалась... - восклицает Дмитрий. - Я считаю, что это всё сделано для того, чтобы вывести её из равновесия, чтобы уничтожить. Её пытаются закрыть как маньяка, который годами издевался над детьми, а не воспитывал умных и счастливых детей. Никаких травм или увечий дети не получали. Если она где-то перегнула палку по меркам закона, то это максимум административка. Если уж так хотели наказать, могли бы дать условно. Но вот так — за что?»

В декабре, после вынесения Моцной приговора, в суд Климовичского района обратилась за разъяснением «Комсомольская правда в Белоруссии». В суде газете сообщили, что Ирина Моцная частично признала свою вину в истязании заведомо несовершеннолетних и жестоком обращении с подопечными. А вот обвинения в незаконном лишении свободы детей, женщина отрицает.

# ДАЖЕ В ТЮРЬМЕ ИПЭШНИКИ НЕ ИЗБЕГУТ ВЗНОСОВ В ФОНД СОЦИАЛЬНОЙ ЗАЩИТЫ

Илья МАЛИНОВСКИЙ, Еврорадио

***Избежать годовой выплаты в почти 7 миллионов могут только пенсионеры, студенты, иностранцы, молодые родители и устроенные на постоянную работу.***




В 2015 году индивидуальные предприниматели впервые платят отдельный вклад в социальный фонд защиты населения, независимо от того, был доход или нет. Сделать это нужно до 1 марта.

«Вы можете платить исходя из вашего дохода, но вклад не может быть меньше минимального, — комментируют в минском отделении фонда. — Этот минимум определяется как 35% от проиндексированной минимальной заработной платы. Но на сегодня мы знаем сумму только за 11 месяцев, сколько получится за декабрь, станет известно только после 15 января. Пока годовой взнос, но без двенадцатого месяца, составляет 6681000».

Даже, если ты осуществляешь предпринимательскую деятельность раз в год, например, проводишь собственный концерт в каком-нибудь минском клубе, то вклад всё равно должен платить за весь год. Даже официальное прекращение деятельности в налоговой не спасёт предпринимателя от Фонда социальной защиты!

«Нам сейчас звонят, спрашивают разные категории, — признаются Еврорадио сотрудники фонда. — Но даже если ты сидишь в тюрьме, то всё равно должен платить. Болеешь ты или нет — всё равно. Единственное, если вы заболели, и у вас есть выплаты за предыдущий год, то из них насчитывается ваш больничный. То есть по больничному в этом году вы будете оплачивать меньше на сумму этой больничной помощи».

Существуют пять позиций, по которым ипэшник может избежать страховых выплат: если у вас есть рабочие отношения, вы получаете пенсию или пособие на ребёнка до 3-х лет, если являетесь студентом дневной формы обучения или иностранным гражданином. Под трудовыми отношениями понимают именно устройство на работу. Договор-подряд является гражданско-правовым документом и в этом случае в учёт не идет.

«Говорят, что с 2015 года эту льготу по трудовым отношениям отменят, — внезапно предупреждают Еврорадио в Фонде социальной защиты. — И будут уже удерживать вклад из зарплаты на вашей работе, и за ИП вы будете отдельно платить. Пока ещё эту льготу не отменяли, но об этом уже говорят. Если об этом говорят, то, наверное, так и сделают».

Единственное подлинное спасение помимо пяти льготных позиций — закрыть ИП. «Так многие сейчас и делают», — резюмируют в Фонде социальной защиты населения.

## *НОВОСТИ РЕГИОНА*

### *ЕЩЁ СПОЁМ!*

***В наступившем 2015 году народный хор из города Климовичи готов покорять новые творческие вершины. В прошлом году Климовичскому народному хору народной песни исполнилось 65 лет. К этому славному юбилею его привели песни, концерты и выступления. Хор был организован в 1949-м заслуженным деятелем культуры БССР Леонидом Ячневым, звание народного получил в 1974-м. Коллектив неоднократно выезжал с концертами за пределы Беларуси: в Германию, Нидерланды, Бельгию, Польшу и другие страны.***

### *МИР ДОМУ ТВОЕМУ*

***В Звенчатской сельской библиотеке Климовичского района открылся Центр духовного просвещения «Мир дому твоему». Событие произошло в конце декабря, собрав на мероприятие читателей библиотеки и прихожан Звенчатской церкви. Книжный фонд православной литературы будет способствовать духовно-нравственному воспитанию подрастающих поколений на основе христианских ценностей. Именно в этом видит одну из своих главных задач созданный в Звенчатке Центр духовного просвещения.***

### *РОЖДЕСТВЕНСКАЯ ЁЛКА*

***Дети из Беларуси, России и Украины приняли участие в рождественской благотворительной акции в Минске. По информации БЕЛТА, 8 января в Минск были приглашены юные жители из районов Гомельской, Могилёвской, Минской областей, а также Брянской, Смоленской (Россия) и Черниговской областей (Украина), пострадавших от чернобыльской аварии. Праздничное мероприятие прошло в рамках республиканской благотворительной акции «Рождественская ёлка - наши дети». От Могилёвщины были представители Костюковичского, Краснопольского, Климовичского и Чериковского районов.***

# ОМОН «ПОЧИСТИЛ» КЛИМОВИЧИ

**Михаил ПЕТРОВ**

***За последнее время в сводках Управления внутренних дел Могилёвского облисполкома стал всё чаще упоминаться Климовичский район. Характерно, что большая часть этих сведений объединена одной темой — нелегальным алкоголем.***




Напомним, например, такой многозначительный факт. В конце осени в деревне Звенчатка сотрудниками правоохранительных органов как минимум дважды задерживали перевозчиков, везущих нелегальную алкогольную продукцию в Калужскую область. Вначале милицией была задержана автомашина «ВАЗ» под управлением жителя города Обнинск Калужской области. Как сообщалось на сайте УВД облисполкома, в автомобиле обнаружено и изъято 200 литров водки, не маркированной акцизными марками.

Затем произошёл второй подобный случай. Автомашина «Ситроен» под управлением жителя Калужской области перевозила 140 бутылок водки емкостью 0,5 л - всего 70 литров. Алкогольная продукция перевозилась без соответствующих документов, поэтому была изъята.

Благодаря действиям правоохранительных органов, нелегальный алкоголь в Россию не доходит. Но самое интересное здесь не куда, а откуда в таком количестве везут не маркированную водку?

Заставляют задуматься над этим вопросом и события недавнего декабря. Как информирует сайт областного УВД, 24 декабря сотрудники роты ОМОН ГУВД Мингорисполкома провели рейд в городе Климовичи. По улице Советской в ходе санкционированного осмотра жилища у неработающего климовчанина было обнаружено и изъято 5 литров спирта. У другого жителя Климовичей на улице М. Горького изъято 56 литров спирта. У пенсионерки, проживающей на улице Космонавтов, обнаружено 12 литров спирта. А в доме по улице Железнодорожной у хозяйки нашли и изъяли 65 литров (130 бутылок водки производства РФ) и 1 литр спирта.

Судя по всему, криминальные спиртовые и водочные реки берут своё начало в Климовичах, а далее разливаются по окрестным просторам как Беларуси, так и России.

# В КРИЧЕВСКОМ РАЙОНЕ ОБНАРУЖЕНЫ ХИЩЕНИЯ НА СОТНИ МИЛЛИОНОВ РУБЛЕЙ

**Артём СЕМЁНОВ**

***В декабре в Кричевском районном суде началось рассмотрение дела о хищении в особо крупном размере группой лиц, ранее работавших в местном потребительском обществе. Отдельные подробности, прозвучавшие в ходе судебного разбирательства, уже появились на страницах независимых СМИ, в частности, в региональном издании «Вольны горад». А вот официальные средства массовой информации почти не затронули эту тему, хотя постоянно декларируют необходимость и важность борьбы с коррупцией.***

Как сообщает «Вольны горад», дело слушается под председательством судьи М. Браусова. В качестве государственного обвинителя выступает заместитель прокурора Кричевского района С. Ларина. Отметим, что для описания совершённых преступных деяний ей пришлось в течение более 5 часов зачитывать предъявленное подсудимым обвинение. Уже одно это позволяет представить масштабы содеянного.

Всего по делу проходит 8 человек. Шесть из них обвиняются в хищениях путём злоупотребления служебными полномочиями (статья 210 Уголовного Кодекса РБ «Хищение путём злоупотребления служебными полномочиями»). Это бывшие работники (продавцы и заведующие) ряда магазинов местного потребительского общества. На суде были названы суммы похищенных ими денежных средств — в целом около 250 млн. рублей. Присутствовавшие на судебном заседании кричевляне говорят, что эти обвиняемые признают свою вину и подтверждают факты, названные государственным обвинителем.


Свою вину не признала продавец одного из магазинов, которой было предъявлено обвинение в хищении 16 млн. рублей. Также своей вины не признаёт бывший бухгалтер бывшего Кричевского райпотребсоюза, которой предъявлено обвинение по частям 2 и 3 статьи 210 Уголовного Кодекса РБ. В данном случае называются гораздо более значительные суммы, её обвиняют в хищении 270 млн. рублей.

Уже начало рассмотрения данного дела показало, что судебное разбирательство может продлиться достаточно долго, так как требует изучения значительного количества документов, фактов и свидетельских показаний. Но это не должно стать помехой для правосудия, если оно в самом деле нацелено на устранение нарушений закона и наказание виновных. При этом, конечно, не следует забывать, что одним из основных принципов проведения судебных разбирательств является их гласность и открытость, что демонстрирует работу судебной системы и является важным средством профилактики правонарушений среди населения.

# МІНІСТР-РЭФАРМАТАР ВАСІЛЬ ЛЯВОНАЎ

**Аляксандр ВЛАД**

***Раніцай 4 студзеня на 77-м годзе жыцця памёр вядомы грамадскі дзеяч, былы міністр сельскай гаспадаркі Беларусі Васіль Лявонаў.***



На Магілёўшчыне Лявонава памятаюць дасюль. Асоба легендарная, што могуць засведчыць і клімаўчане. У свой час Васіль Севасцьянавіч восем гадоў адпрацаваў на клімавіцкай зямлі. Таму і на Клімаўшчыне яшчэ доўга будуць узгадваць пра гэтага чалавека.

Былы першы сакратар Магілёўскага абкама партыі пасля 1991 года стаў на бок грамадскіх перамен. У гэты час ён быў накіраваны гандлёвым прадстаўніком Беларусі ў Федэратыўную Рэспубліку Германія, дзе адпрацаваў некалькі гадоў, набыў новы досвед і сувязі. І калі Лукашэнка прызначыў яго міністрам сельскай гаспадаркі, Васіль Лявонаў выступіў з прапановамі аб рэфармаванні беларускага АПК. Пры ім міністэрства накіравала сваю дзейнасць на рэфармаванне калектыўнай уласнасці, далучэнне сельскай гаспадаркі да рынкавай эканомікі, вызваленне сялян ад каманднa-адміністрацыйных метадаў.

Лукашэнка ўспрыняў рэфарматарскія прапановы Лявонава з незадавальненнем. Да таго ж ён памятаў, што падчас выбараў першага прэзідэнта Беларусі Лявонаў падтрымліваў не яго, а Кебіча. У рэшце рэшт у Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання пачаліся праверкі. 11 лістапада 1997 года Васіль Лявонаў быў арыштаваны ў працоўным кабінеце. Яго арышт здымала група аператараў БТ. Экс-міністру былі прад’яўленыя абвінавачанні па некалькіх артыкулах Крымінальнага кодэкса.

Следства цягнулася некалькі гадоў, а ў 2000 годзе Лявонаў быў прызнаны Вярхоўным судом вінаватым у хабарніцтве і крадзяжы дзяржаўнай маёмасці ды пакараны 4 гадамі калоніі з канфіскацыяй маёмасці. На судзе былы міністр віны не прызнаў, заявіўшы, што лічыць сваё зняволенне палітычнай справай, бо, па яго меркаванні, яго судзіць не суд, а асабіста Лукашэнка.

Трапіўшы ў зняволенне, Лявонаў пакутаваў на шэраг цяжкіх хранічных захворванняў. Стан яго здароўя значна пагоршыўся, ён перанёс некалькі сардэчных прыступаў. У тым жа 2000-м годзе яго вызвалілі паводле амністыі.

Далейшае жыццё Васіля Лявонава паказала, што турма не зламала яго як асобу. Ён шмат займаецца грамадскай дзейнасцю, напісаў кнігу ўспамінаў, заўсёды выказваў свае думкі для незалежных СМІ. Нельга не прызнаць, што сярод шматлікіх кіраўнікоў рознага ўзроўню, якіх напрызначаў Лукашэнка за 20 гадоў сваёй улады, гэта быў адзін з лепшых міністраў.

## * БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА:

**ЛЯВОНАЎ Васіль Севасцьянавіч –**

Нарадзіўся 16 красавіка 1938 года ў вёсцы Дубянец Касцюковіцкага раёна. Бацька і старэйшы брат загінулі на фронце. Скончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі (1964).

Працаваў цесляром у калгасе "Кранштадт" Касцюковіцкага раёна (1956 - 1958), шахцёрам у Данецкай вобласці (1958 - 1959), інспектарам-арганізатарам па механізацыі Краснапольскага вытворчага ўпраўлення (1964), інжынерам-механікам саўгаса "Клімавіцкі" (1964 - 1967), дырэктарам саўгаса "Мілаславіцкі" (1967 - 1972), першым намеснікам начальніка Магілёўскага абласнога ўпраўлення сельскай гаспадаркі (1972 - 1975), старшынёй Горацкага райвыканкама (1975), першым сакратаром Горацкага райкама КПБ (1975 - 1979), сакратаром Магілёўскага абкама КПБ (1979 - 1982), першым намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама (1982 - 1983), першым сакратаром Магілёўскага абкама КПБ (1983 - 1990), старшынёй Магілёўскага абласнога Савета народных дэпутатаў (1990 - 1991).

У 1991 годзе адпраўлены гандлёвым прадстаўніком Беларусі ў Федэратыўную Рэспубліку Германія (1991 - 1993). Абраны генеральным дырэктарам Беларускай аграпрамысловай асацыяцыі "Белінтэраграпрам" (1993 - 1994). Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь (1994 - 1997).

У 1997 публічна абвінавачаны прэзідэнтам і 11 лістапада арыштаваны проста ў працоўным кабінеце (паказ эпізоду з наручнікамі шматразова паўтарала Беларускае тэлебачанне) па абвінавачанню ў фінансавых махінацыях і злоўжыванні службовым становішчам.

14 студзеня 2000 года асуджаны на 4 гады турмы. 5 кастрычніка 2000 года выйшаў на свабоду па амністыі. Пасля вызвалення быў на пенсіі, займаўся грамадска-палітычнай дзейнасцю.

# ПЯЦЬ ГАДОЎ ТАМУ Ў КЛІМАВІЧАХ ЗАКРЫЛІ ДАПАМОЖНУЮ ШКОЛУ-ІНТЭРНАТ

Вясной 2010-га навучэнцы Клімавіцкай дапаможнай школы-інтэрнат заканчвалі не проста вучобу. Гэта быў апошні год у дзейнасці самой школы, якая праіснавала некалькі дзесяцігоддзяў. Навучальная ўстанова была створана для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Тут яны атрымлівалі адукацыю, працоўныя і грамадскія веды, рыхтаваліся да далейшага жыцця. Але дзяржава усё ж прыняла рашэнне зачыніць школу.

Як гэта было — чытайце ў архіўным матэрыяле БелаПАН ад 12 траўня 2010 года.

## У КЛІМАВІЧАХ ЗАКРЫВАЮЦЬ СПЕЦЫЯЛІЗАВАНУЮ ШКОЛУ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ З АСАБЛІВАСЦЯМІ ПСІХІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ

***У райцэнтры Клімавічы Магілёўскай вобласці закрываюць дапаможную школу-інтэрнат. У ёй вучацца дзеці з разумовымі адхіленнямі. У аддзеле адукацыі райвыканкама закрыццё спецыяльнай навучальнай установы аргументуюць тым, што на аднаго вучня дзяржава выдаткоўвае зашмат сродкаў. Наступны навучальны год дзеці з асаблівасцямі псіхічнага развіцця сустрэнуць у звычайных школах.***

Пра закрыццё школы стала вядома дзякуючы пратэстам бацькоў. Іх абурэнне спрабавалі суняць на сходзе.

Пра гэта паведаміў Міхаіл Лаковіч, дзед гадаванца гэтай школы: «Прэсавалі на сходзе людзей, асабліва метадыст. З ёй дужа схапіліся. Я гавару, спецыялісты ж у школе працуюць. Там дзеці да канца школы паступаюць у Хоцімск у вучэльню. Яны ў сваёй школе, як браты. А ў інтэграваных класах яны па два гады праседзелі, ні "а" ні "б" — нічога. Калі хто захоча, кажуць нам, навучыцца — яны навучацца».

Праблемы ў школе-інтэрнаце пачаліся два гады таму, калі яе ўтрыманне пераклалі з абласнога бюджэту на раёны. У школе пакінулі толькі мясцовых дзетак. Нетутэйшых размеркавалі па іншых установах вобласці. Тое, што школу сёлета закрываюць, пацвердзілі ў райвыканкаме.

«Дужа вялікія выдаткі на адно дзіця, — паведаміла начальніца аддзела адукацыі райвыканкама Тацццяна Марус. — Сёлета гэта было каля 15 мільёнаў. Калі школа-інтэрнат была абласнога падначалення, у ёй займаліся 198 дзетак з усяе вобласці. Пасля таго як школа стала раённага падначалення, то ў ёй цяпер займаюцца 38 вучняў. Розніца занадта вялікая».

Тым часам калектыў школы-інтэрната не мае пэўнасці ні адносна свайго працаўладкавання, ні наконт будучыні сваіх гадаванцаў.

«У нас школа спецыялізаваная з працоўным ухілам. Пасля школы мы стараемся, каб нашыя дзеткі пайшлі далей вучыцца. Прасочваем, хадайнічаем, каб іх працаўладкаваць. Што будзе далей — гэта вялікае пытанне. Мы ўжо змірыліся. А што рабіць? Відаць, іншага шляху няма. Цяпер у нас дзетак 38. А на наступны год застаецца 25. Для 25 чалавек, канечне, ніхто школы трымаць не будзе», — зазначыла ў тэлефоннай гутарцы супрацоўніца школы-інтэрната.

Клімавіцкая школа-інтэрнат — не першая, якую зачыняюць. Ва ўпраўленні спецыяльнай адукацыі Беларусі паведамілі, што за апошняе дзесяцігоддзе закрыліся каля 30% навучальных устаноў для дзяцей з псіхічнымі адхіленнямі.

На Магілёўшчыне засталося толькі тры школы для дзяцей з разумовымі адхіленнямі. У клімавіцкай жа раней вучыліся дзеці з дзевяці раёнаў вобласці.

# МИНЗДРАВ ЗАПРЕТИЛ УВЕЛИЧИВАТЬ ЦЕНЫ НА ПЛАТНЫЕ МЕДУСЛУГИ ДЛЯ ГРАЖДАН БЕЛАРУСИ

***Минздрав запретил увеличивать цены на платные медицинские услуги для граждан Беларуси. Об этом говорится в соответствующем письме заместителя министра здравоохранения Вячеслава Шило, сообщает БЕЛТА.***



Согласно письму, которое опубликовано в ведомственной газете «Медицинский вестник», управлениям здравоохранения в регионах, руководителям госорганизаций, подчиненных Минздраву, субъектам хозяйствования негосударственной формы собственности поручено не допускать роста цен на платные медуслуги для граждан Беларуси (в том числе на используемые расходные материалы), оказываемые юрлицами и ИП.

Кроме того, руководству областных управлений здравоохранения, председателю комитета по здравоохранению Мингорисполкома поручено организовать четкую систему контроля за изменением уровня цен на платные медуслуги.

«При выявлении нарушений будут приняты меры ответственности к руководителям, не обеспечившим выполнение данного поручения», — говорится в письме.

# ЗА ГАДЫ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ Ў БЕЛАРУСІ СТАЛА НА 200 ПОМНІКАЎ ЛЕНІНУ МЕНШ

Алесь ПІЛЕЦКІ, Еўрарадыё

***Але засталося яшчэ 400. Еўрарадыё падлічыла статуі Ільіча ў нашай краіне і даведалася, дзе іх больш за ўсё.***

***СТАТУС "НЕДАТЫКАЛЬНЫХ"***

У Міністэрстве культуры на пытанне аб колькасці помнікаў Леніну ў Беларусі толькі паціскаюць плячыма. Маўляў, адкуль нам ведаць? Адзінае, што можна падлічыць дакладна — гэта колькасць помнікаў, унесеных у спіс гісторыка-культурнай спадчыны. У Мінкульце мяркуюць, што гэтага заслугоўваюць толькі самыя выдатныя экземпляры.

"У нас няма такой мэты — надаць усім аб'ектам, створаным за апошнія 40 гадоў, статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Такі статус надаецца найбольш каштоўным аб'ектам", — гавораць ва Упраўленні па ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

Таму статус "недатыкальных" у Беларусі маюць толькі дзевяць помнікаў Уладзіміру Ільічу: сталічны з плошчы Незалежнасці, пінскі, брэсцкі, віцебскі, гомельскі, магілёўскі, салігорскі і помнік у Баранавічах. Усе іншыя, а іх у Беларусі каля 400, каштоўнасці не ўяўляюць і апякуюцца імі адно мясцовыя ўлады ды адміністрацыі прадпрыемстваў.

Маскоўскі культуролаг Дзмітрый Кудзінаў, які збірае інфармацыю аб помніках Леніну па ўсім свеце, расказвае, што ў Беларусі ўвогуле асаблівае стаўленне да спадчыны Ільіча. Такога няма ні ў Расіі, ні ў Казахстане, ні ў Малдове.

"Напэўна, Беларусь — гэта адзіная рэспубліка з былога СССР, дзе помнікі Леніну не зносілі цэнтралізавана. Практычна ўсе помнікі ў раённых, абласных цэнтрах захаваліся. Стаяць у цэнтрах гарадоў, захаваліся і нікуды не перанесеныя", — расказвае Дзмітрый.

***ШТО КАЖА СТАТЫСТЫКА?***

У калекцыі Кудзінава — больш за восем тысяч фотаздымкаў самых розных помнікаў Ільічу. Культуролаг гаворыць, што пачаў збіраць фота помнікаў не праз нейкія палітычныя перакананні. Хутчэй праз краязнаўчую цікавасць. З часам гэта перарасло ў даволі вялікі праект. На сайце Кудзінава сабраная статыстыка па помніках Леніну ў краінах былога СССР, а таксама па далёкім замежжы. Эксперт расказвае, што нават у Малдове, дзе доўгі час пры ўладзе былі камуністы, пасля распаду СССР помнікі Леніну прыбіралі з цэнтральных плошчаў.

"Таго, каб помнік заставаўся, там няма. Магчыма, помнік зносяць, магчыма, пераносяць у парк. Не так, як ва Украіне, альбо на пачатку 1990-х, калі тросам помнікі сцягвалі. Цяпер у Малдове іх ціха прыбіраюць падалей. У Казахстане таксама гэтак робяць з помнікамі Леніну".

Прыбіраюць з цэнтральных плошчаў і вуліц помнікі Леніну і ў Расіі. Хоць у правінцыі да гэтага пакуль не дайшло. У нашых усходніх суседзяў захавалася каля 6000 Леніных (на пачатку 1990-х было 8000). На другім месцы пакуль Украіна, дзе пасля распаду СССР было 5500 помнікаў, а да сёння пакуль захавалася 1800 з іх. Трэцяе месца за Беларуссю — у нас захавалася 400 з 600 помнікаў. 300 Леніных засталося ў Казахстане, 200 — у былых закаўказскіх і сярэднеазіяцкіх рэспубліках. 60 — у Малдове, 25 у краінах далёкага замежжа. А вось у балтыйскіх краінах усіх Леніных дэмантавалі амаль адразу пасля абвяшчэння незалежнасці. Цяпер пабачыць помнік кіраўніку сусветнага пралетарыяту можна хіба ў адмысловым музеі ў Друскеніках.



***МАСКВА, МІНСК, БАБРУЙСК***

З гарадоў на першым месцы па помніках Леніну цвёрда стаіць Масква — тут іх ажно 101. На другім месцы Санкт-Пецярбург з 74 помнікамі, трэцяе, па дадзеных на пачатак года, пакуль у Харкава — 28. Але гэта, відаць, ненадоўга. У Беларусі больш за ўсё помнікаў Леніну захавалася ў Мінску — 16. Але на пачатку 1990-х першынство было ў Бабруйска — 22 помнікі. Да кастрычніка 2014 дажылі толькі 9 штук.

"Па вялікім рахунку, цяпер людзі не тое каб хочуць пакінуць помнікі. Маўляў, давайце пакінем помнік, бо Ленін — гэта такая значная фігура. Стаіць і стаіць. Большая частка людзей мяркуе, што з гэтымі помнікамі нічога не трэба рабіць. Але калі ўзнікне моцная сіла, якая палічыць, што зносіць трэба — то іх знясуць. Як цяпер робяць ва Украіне. Там людзям падаецца, што знос помнікаў нешта зменіць да лепшага. У такім выпадку трэба зносіць", — мяркуе Дзмітрый Кудзінаў.

Пакуль жа Леніны стаяць збольшага спакойна. Асаблівa ў Беларусі. Прынамсі, палова з помнікаў Уладзіміру Ільічу на постсавецкай прасторы выканана менавіта стоячы. "Сядзячых" зафіксавана толькі 225. Рэшта — бюсты і выявы Ільіча па пояс. Цікава таксама, што часцей за ўсё скульптары бачылі Леніна з выцягнутай (ці працягнутай, каму што бліжэй) рукой. Часам з кепкай, альбо ў кампаніі з іншымі дзеячамі свайго часу. А вось радзей за ўсё можна сустрэць Леніна ў шапцы. Такіх помнікаў ва ўсім свеце вядома толькі 18 штук.

# БЕЛАЗ, МАЗ, МТЗ — САМЫЯ СТРАТНЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ БЕЛАРУСІ



Еўрарадыё паведамляе, што Міністэрства фінансаў апублікавала фінансавыя вынікі адкрытых акцыянерных таварыстваў (акрамя банкаў) за тры кварталы 2014 года. Першае месца па прыбытковасці трымае "Беларуськалій" — 5734 млрд рублёў. За ім следам ідуць Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод (2296 млрд) і наваполацкі "Нафтан" (1083 млрд).

Табліцу самых стратных прадпрыемстваў узначаліў БелАЗ — мінус 304,9 млрд руб. За ім следам ідуць Мінскі трактарны завод (мінус 243,7 млрд) і МАЗ (мінус 229,2 млрд).

# РОДИТЕЛЯМ ВСЕГДА ЕСТЬ ЧТО РАССКАЗАТЬ ДРУГ ДРУГУ ПРО СВОИХ НЕПОВТОРИМЫХ ДЕТЕЙ

Подружка везёт 3-хлетнюю доченьку утром в садик. Ребёнок, конечно, сонный и досыпает по дороге. Водитель такси:

— А кто это у нас тут такой маленький, хорошенький и как нас зовут?

Сашенька, не открывая глаз:

— ОТВАЛИ!

***

У меня есть приятельница, а у приятельницы есть пятилетний сын. Приятельница учится на вечерних курсах, детку девать особо некуда, регулярно таскает его с собой — малец сидит там на задней парте, рисует, читает, играет в нешумные игры. Это было предисловие.

История: едем мы тут на днях вместе с приятельницей и мальцом в троллейбусе. А по пути магазин тканей, в витрине которого из кусочков ткани выложена буква «S».

Малец (философски):

— Ну, вот… Интегралов везде понавешали.

Какой-то дядечка лет 40 спрашивает, улыбаясь:

— Где интегралы? Какие интегралы?

Малец показывает:

— Вон… Ну, обычный, неопределённый.

— Почему неопределённый???

Малец, уже устав от дядиной бестолковости:

— Потому что пределы интегрирования не обозначены…

***

Бежим утром с сыном в школу, которая находится в другом микрорайоне. Малой развлекает меня, сонную, рассказами о местных достопримечательностях:

— А вот тут мы с Людочкой видели крысу. Мы кинули в её сторону камешек, и крыса на нас наругалась…

— Это как?

— Ну, вот так: «пи-пи-пи»!

— С чего ты взял, что она ругалась? Может быть, она с вами знакомилась?

Пауза. И далее с осуждением:

— Мамочка, ты что, знакомишься с теми, кто кидает в тебя камни?!

# МІНІМАЛЬНАЯ ЗАРПЛАТА Ў ПОЛЬШЧЫ ВЫРАСЛА НА 70 ЗЛОТЫХ У 2015 ГОДЗЕ МІНІМАЛЬНАЯ ЗАРПЛАТА ПАЛЯКАЎ СКЛАДЗЕ АМАЛЬ 500 ДОЛАРАЎ.

1 студзеня ў сілу ўступіла распараджэнне Рады міністраў, згодна з якім мінімальная зарплата ў Польшчы ў 2015 годзе павінна складаць 1750 злотых (амаль 500 долараў). У параўнанні з мінулым годам узровень мінімальнай зарплаты вырас на 70 злотых (амаль 20 долараў).

# ВЫРОСЛИ ЦЕНЫ ЭКЗАМЕНОВ НА ВОДИТЕЛЬСКИЕ ПРАВА



***За практику — в 10 раз, за теорию — в 6 раз. Новые цены вступили в силу с 8 января, информирует Еврорадио.***

Новые цены на услуги ГАИ начали действовать в Беларуси с 8 января. Как отмечает портал tut.by, они стали сюрпризом для курсантов, поскольку никто об изменении цен на услуги не предупреждал.

Теперь сдача теоретического экзамена будет стоить 54 тысячи рублей (цены выросли в 6 раз), практического — 180 тысяч (цены выросли в 10 раз). Стоимость компьютерных услуг и оформления заявления на подачу документов, а также самого удостоверения водителя остались прежними.

# ЗВЯРНУЦЬ УВАГУ!!!

У інтэрнэце пачала дзейнічаць КЛІМАВІЦКАЯ СТАРОНКА, якую размясціла сацыяльная сетка Укантакце. Гэта — Суполка актуальных гарадскіх навін, Суполка тых, хто любіць родны горад Клімавічы. На старонцы шмат фатаграфій, навіны, падзеі, спасылкі на цікавыя сайты.

Далучайцеся, супрацоўнічайце, рэкамендуйце сваім знаёмым!

Адрас КЛІМАВІЦКАЙ СТАРОНКІ - vk.com/klimavichy

## *ІНТЭРНЭТ-БІБЛІЯТЭКА KAMUNIKAT.ORG: КНІГІ, ГАЗЕТЫ, ЧАСОПІСЫ, АЎДЫЁ, ВІДЭА*

Праект “Беларуская інтэрнэт-бібліятэка Kamunikat.org”, які рэалізуе Беларускае гістарычнае таварыства, існуе з 2000 году і арыентаваны на збор незалежных беларускіх выданняў. На сайце www.kamunikat.org можна знайсці кнігі, газеты, часопісы, аўдыё і відэа. А ў раздзеле “Перыёдыка” знаходзяцца ўсе нумары “Клімавіцкай Інфа-Панарамы” за 2012, 2013 і 2014 гг.

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

*Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь*
*Адказны за выпуск: Аржанцаў Сяргей Юр’евіч*
*Адрас: Клімавічы, вул. Леніна, д. 27а, кв.15.*
*Надрукавана на ўласным абсталяванні. Наклад 299 асобнікаў*
*Распаўсюджваецца бясплатна*